# Грамніцы — свята ў гонар Божага агню і свечкі

**У аснове структуры традыцыйнага календара беларусаў закладзена падпарадкаванне святкавання асноўных падзей згодна з рухам Сонца па небасхіле. Разам з тым, у гадавым цыкле ёсць святы, прымеркаванасць якіх на сучасным этапе застаецца не да канца зразумелай і патлумачанай. Да такіх каляндарных загадак адносіцца святкаванне Грамніц (царкоўная назва свята — Стрэчанне) 15 лютага.**



У самой назве свята чуецца нешта міфічнае, быццам прыхаванае ўшанаванне старажытнаславянскага вярхоўнага бажаства Перуна — уладара жыватворнага агню. Зніταванасць зместу і назвы іншых святаў — Купалле, Масленіца, Багач — яскрава сведчыць пра тое, што свята Грамніцы павінна было атрымаць назву Пеpуніцы. Аднак гэтага не адбылося. Мабыць, тут спрацаваў прыродны феномен: задоўга да таго, як Пярун пачне паласаваць неба сваімі сярэбранымі або залатымі стрэламі, чалавек здалёку пачуе папераджальныя грымоты. Гром-Грамаўнік імчаў наперадзе калясніцы Перуна і абвяшчаў людзям: сцеражыцеся, маліцеся, прымайце адпаведныя захады, зрабіце ўсё неабходнае, каб захаваць сваё жытло і сядзібу!

РЕПОЗИТОРИЙ

Відаць, менавіта таму славянскія народы з асаблівай пашанай ставіліся да моманту першага грому ў новым годзе. Ён быў своеасаблівым прадказальнікам будучага ўраджаю і, адпаведна, дабрабыту сям'і, а таксама здароўя чалавека. Існавалі прыкметы: "Калі гром грыміць на зялёны лісток, то будзе багаты гадок" і, наадварот, калі гром прагрыміць на "голы" лес — год будзе галодны. Пачуўшы першы гром, чалавек павінен быў выканаць некаторыя рытуальныя дзеянні: стаць спінай да дуба; тройчы перакуліцца праз галаву або проста пакачацца па зямлі, каб не балела спіна.

І гэта далёка не адзінкавы прыклад, калі прырода, наваколле, птушыны свет "прыносілі" чалавеку весткі з будучыні ў своеасаблівай, закадзіраванай, шматзначнай форме. Убачыўшы першы раз маладзік, чалавек прасіў у яго вельмі незвычайнай дапамогі — максімальнага спрыяння фінансаваму становішчу, для гэтага трэба было патрэсці-"пазвінець" манетамі ў кішэні. А хто ж не ведае, што, пачуўшы вясной першы раз кукаванне зязюлі справа, можна спадзявацца на ўдачлівы год, злева — наадварот.

У шматаспектным дыялогу чалавека з прыродай сваё непаўторнае гучанне мелі і Грамніцы — старажытнае свята нашых продкаў у гонар агню. Як дзіця Сонца, агонь меў шмат аблічаў: тая самая калядная зорка і грамнічная свечка, масленічнае або купальскае вогнішча сталі сімваламі прыярытэтаў усёй духоўнай культуры беларусаў. Гэта святло надзеі, спадзяванняў, пераспрогі, знак светласці самой душы і яе памкненняў; нарэшце, гэта радасць самога жыцця, існасці, вызначальная рыса нацыянальнага менталітэту: памятаеце — пакуль на небе гарыць наша зорка, мы жывём на нашай прыгажуні-зямлі. Відаць, зусім невыпадкова пасля ваеннага ліхалецця на беларускай зямлі ўспыхнулі нават творныя свечкі — Вечныя Агні, як сімвал памяці, непераможнасці, душэўнай і фізічнай нязгаснасці нашага народа. Глыбінная і ўсёабдымная эстафета памяці: купальская папараць-кветка — казачная Жар-птушка — калядная зорка — грамнічная свечка — і Вечны Агонь.

Былая загадчыца бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Галіна Дашкевіч аднойчы расказала цікавую гісторыю. Улетку яна адпачывала на дачы. Неяк у пятніцу вырашыла з'ездзіць у Мінск. Ідзе да станцыі электрацягнікоў, а насустрач яе суседзі па дачы. Адзін, другі, трэці — і ўсе ў руках нясуць па доўгай лучыне. Пачала пытацца — адкуль і што? Аказалася, на іх дарозе стаяла елка, у якую ўдарыла маланка. Недзе на ўзроўні двух метраў дрэва было зламана і абпалена. Людзі падыходзілі, аддзіралі ад уцалелага камля лучыну і бралі з сабой, каб... захаваць дачны домік ад маланкі і пажару!

Гэты аповед быў настолькі красамоўным і каштоўным у этнаграфічным плане, што прымусіў нас перагледзець шматлікія пытанні, звязаныя з гісторыяй фарміравання і абрадавым зместам свята Грамніц, блізкароднаснага да яго абраду "Ваджэння і пахавання стралы" і гісторыка-культурнай пераемнасці паміж грамніцай-лучынай і свечкай-грамніцай.

### Чаму Грамніцы святкуюць зімой

Нягледзячы на паэтычную прыладжанасць часу святкавання Грамніц у шэраг прыказак і прымавак, сучаснага чалавека ўсё ж здзіўляе, чаму свята ўшанавання Ільі Грамавержца адзначаецца летам (2 жніўня), а



яго папярэдніка — уладара нябёсаў Перуна, Грамаўніка — усходнія славяне славяць 15 лютага? Што гэта — парадокс, часавы алагізм або вынік жорсткага націску хрысціянскай традыцыі?

Пакуль што зразумела толькі адно: сучасная дата святкавання Грамніц напрыканцы зімы — з'ява вельмі позняя і цалкам суадносіцца з хрысціянскай традыцыяй, якая, у сваю чаргу, абапіраецца на традыцыю старажытных іўдзеяў прыносіць немаўля ў храм на саракавы дзень пасля нараджэння. Тое ж самае тычылася і маці-парадзіхі: толькі праз сорак дзён яна атрымлівала правы прайсці абрад ачышчэння і далучэння да царквы. Ад Раства Хрыстовага да Стрэчання (руская царкоўнаславянская назва Сретенье) якраз роўна 40 дзён.

У разуменні хрысціянскіх багасловаў Стрэчанне адзначаецца як свята сустрэчы старазапаветнай і новазапаветнай традыцый і веравызнанняў. На зямлю прыйшоў Агнец Божы для выратавання чалавецтва ад першароднага грахоўнага падзення. Стрэчанне — гэта сімвалічная перадача духоўнай эстафеты ад апошніх прадстаўнікоў дахрысціянскага свету Творцу новага свету, у асобе якога ўжо суіснавалі два пачаткі — Боскі і Чалавечы.

У народным асяроддзі гэта знакамітая і лёсавызначальная падзея была асэнсавана па-свойму, атрымала дадатковае адценне і стала ўспрымацца як прыродна-касмічнае "Стрэчанне" — сустрэча зімы з вясною. Захавалася народная песня, якая якраз і падкрэслівае адметнасць падзеі святочнага дня:

*А ў нас сёння Стрэчанне, Стрэчанне,*
*Зіма з летам сустрэлася, сустрэлася.*
*Лета зіму піхнула, піхнула,*
*І ножачку звіхнула, звіхнула.*
*Зіма пайшла плачучы, плачучы,*
*Лета пайшло скачучы, скачучы.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што ж магло адбывацца раней, у які час Грамніцы адзначаліся ў дахрысціянскую эпоху? Пераважная большасць сучасных даследчыкаў традыцыйнага календара беларусаў акцэнтуе ўвагу на земляробчым характары свята. Строга кажучы, гэта не зусім дакладна, таму што ў нашай геаграфічнай паласе актыўная праца на зямлі доўжылася не больш за пяць месяцаў. Ды і сярод святаў майска-вераснёўскага перыяду не ўсе мелі ў якасці вызначальнай земляробчую накіраванасць. Гэта і дае нам падставы сцвярджаць, што каляндар беларусаў, як і іншых народаў свету, быў храналагічнай матрыцай ушанавання багоў, якія "курыравалі" адпаведную сферу жыццядзейнасці соцыума (вясковай абшчыны, племені, асобнага роду). На больш познім этапе, калі распачаўся працэс дэміфалагізацыі архаічнай сістэмы светапоглядных уяўленняў, адбылася прынцыповая рэструктурызацыя календара і пераасэнсаванне сістэмы сацыякультурных каштоўнасцей. Ад міфалагічнай сістэмы захавалася пашана да двух нябесных "метраномаў" — Сонца і Месяца, месца багоў занялі ўяўленні аб актыўным і пастаянным дыялогу з душамі продкаў. І толькі трэцім складнікам стала сістэма вераванняў, звязаная з земляробствам і жывёлагадоўляй. Безумоўна, самым вызначальным крытэрыем упарадкавання быў і застаўся дыялог з Космасам, у якім не апошняе месца належала ўтаймаванню прыродных стыхій, перш за ўсё Грому, Маланкі, Перуна і Граду.

Калі разглядаць святы, падчас якіх выконваюць рытуальныя дзеянні ў гонар Грому, Маланкі і Перуна, то можна заўважыць цікавую трыяду: Грамніцы — "Ваджэнне і Пахаванне стралы" і свята ў гонар Ільі-Грамавержца.

Такім чынам, атрымліваецца выразны малюнак каляндарнага ўшанавання самай разбуральнай прыроднай стыхіі. Звесткі, якія дайшлі да нас у запісах збіральнікаў этнафальклорнай спадчыны, сведчаць пра тое, што знакавай пазіцыяй у веснавым колабегу часу быў першы гром. Але паколькі гэтая з'ява мела лакальны характар і розначасовую прымеркаванасць, то ёй спадарожнічалі індывідуальныя рытуальныя дзеянні. Аднак, думаецца, усё ж у беларусаў было агульнарадавое, абшчыннае свята веснавога ўшанавання Грому-Перуна.

Паказальным у гэтым сэнсе, безумоўна, з'яўляецца абрад "Страла", які лакалізаваўся ў паўднёва-ўсходняй частцы Усходняга Палесся з эпіцэнтрам у Веткаўскім раёне і выконваецца на саракавы дзень пасля Вялікадня — на Ушэсце. Гэты рытуальна-абрадавы комплекс мае ўсе неабходныя складнікі, якія звязаны з культам Перуна і пазнейшым хрысціянскім напластаваннем. Жанчыны-ахоўніцы Роду і захавальніцы хатняга ачага, узяўшыся за рукі, дакладней — пераплёўшы іх у "вяроўку", "выводзілі" "Стралу-маланку" за вёску. На ўскрайку жытнёвага поля яны "хавалі" бліскавіцу. Сёння яе займеннікам выступае пучок жытнёвых каласоў, манета, любы бліскучы прадмет і г.д. А што магло быць раней, у сівой даўніне? У в. Казацкія Балсуны і Пералёўка абрад распачынаецца ваджэннем карагодаў вакол бярозы, якая расце на скрыжаванні вуліц у цэнтры вёскі. Але некалі ролю рытуальнага цэнтра, ядра абрадавага дзеяння выконвала дрэва, у якое ўдарыў Пярун. Замкнуўшы гэта дрэва ў сімвалічнае кола, жанчыны вадзілі карагоды, спявалі гімны ў гонар вярхоўнага бога славянскага пантэона. А затым кожны з удзельнікаў адломваў сабе "грамнічную стралу" (шчэпку або лучыну), і хутчэй за ўсё не адну, "пахаваннем" якой і заканчваўся незвычайны абрад. А яшчэ адну стралу-лучыну людзі неслі дадому, дзе і выкарыстоўвалі ў шэрагу аказіянальных рытуалаў.

З прыходам хрысціянства ролю "стралы" пачала выконваць свечка, якая заняла ключавое месца ў пачатковай фазе святкавання Ушэсця і "Ваджэння стралы", а месцам яе асвячэння стаў храм. Заслугоўвае ўвагі і той факт, што ў абрадзе Грамніц, апісаным вядомым этнографам М.Я. Нікіфароўскім, свечкі, прынесеныя людзьмі ў царкву, складвалі ў адно месца (быццам у адзінае "дрэва", якое пасля асвячэння трэба было падзяліць на "свечкі-лучыны"), праводзілі спецыяльны абрад сабornага паяднання, абшчыннай узаемаспалучанасці, пасля якога грамніца надзялялася статусам касмічнай або Боскай пазначанасці, набывала функцыі абярэга, амулета, талісмана.

**Аксана КАТОВІЧ**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА**



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ